View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk brought to you by CORE



**УДК 398.32**

# СКАРБ РЭАЛЬНЫ І СКАРБ ІДЭАЛЬНЫ ВА ЎЯЎЛЕННЯХ І ПРАКТЫКАХ БЕЛАРУСКАЙ ВЁСКІ XIX–XX стст.[1]

***канд. гіст. навук, дац. У.А. ЛОБАЧ***
**Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт**

*Разглядаецца семантыка скарбаў у міфапаэтычнай карціне свету беларусаў XIX–XX стст. Аналізуюцца ўяўленні, звязаныя са схаванымі каштоўнасцямі, а таксама магічныя спосабы і прыёмы авалодання скарбамі.*

Праблематыка грошай у кантэкце іх сімвалічнай функцыянальнасці ў традыцыйнай беларускай культуры засталася практычна па-за ўвагай айчыннага народазнаўства. Асобныя энцыклапедычныя артыкулы (“Грошы”, “Скарб” і інш.) толькі пункцірна пазначылі магчымыя аспекты даследванняў у дадзеным накірунку [1]. У той жа час семантыка грошай актыўна даследуецца ў расійскай этналогіі і фалькларыстыцы, дзе ўжо знакавай стала праца К.А. Багданава “Деньги в фольклоре” (1995) [2], а новыя падыходы да праблематыкі былі ўвасоблены ў калектыўным зборніку “Фетиш и табу: Антропология денег в России” (2013) [3]. Аднак феномен скарбу ў традыцыйнай духоўнай культуры прадметна не разглядаўся, за выняткам нешматлікіх артыкулаў, прысвечаных лакальнай фальклорнай традыцыі Рускай Поўначы [4] і магічным практыкам, звязаным з ухаваннем каштоўнасцяў [5]. З гісторыка-нумізматычнага гледзішча праблематыку скарбаў, выяўленых на Беларусі, закрануў В.Н. Рабцэвіч [6, с.29–49].

Складанасць даследвання семантыкі скарба абумоўлена тым, што яна неад’емным чынам звязана з сімволікай грошай, якая ў міфапаэтычнай карціне свету беларусаў выяўляецца надзвычай разнастайна і дысперсна адлюстравана практычна ва ўсіх жанрах фальклору і шматлікіх прыктыках рытуальнага характару. У адрозненне ад ментальных фальклорных канструктаў і вобразаў (напрыклад, “Дунай”, “мора” ці “храм, які праваліўся”) грошы і скарб, як іх канцэнтраванае ўвасабленне, адыгрывалі надзвычай важныя ўтылітарныя функцыі (гандаль, накапленне, зберажэнне грашовых сродкаў) у рамках ўсяго грамадства, і вёскі ў прыватнасці. Але менавіта для традыцыйнай супольнасці характэрна максімальная метафарызацыя як гандлю, так і плацёжных сродкаў, калі прагматыка значна пашыраецца за кошт функцый сімвалічнага характару. Такім чынам, перад тым як перайсці да разгляду семантыкі скарбу, ёсць сэнс коратка пазначыць статус грошай у міфапаэтычнай карціне свету беларусаў.

**Грошы** ва ўяўленнях беларусаў характарызаваліся выразнай амбівалентнасцю, калі пазітыўнае ці адмоўнае значэнне выяўлялася толькі ў кантэксце канкрэтнай, семіятычна напружанай стуацыі. Бо, як адзначыў А.Я. Гурэвіч, “грошы самі па сабе не злыя і не добрыя, маральныя катэгорыі ўсплываюць пры іх выкарыстанні. Калі выкарыстанне грошай спараджае сквапнасць і парушае справядлівасць, то грошы – зло” [7, с. 231].

Паводле этыялагічнага апавядання, запісанага на Случчыне, грошы (золата) маюць дэманічную прыроду і з’яўляюцца ў свеце людзей дзякуючы чорту і чалавечай хціваспі [8, с. 225–227]. Аднак у абрадавым фальклоры грошы сімвалізуюць дабрабыт, заможнасць і фігуруюць як адзін з важнейшых складнікаў чалавечай долі, дадзенай яму Богам. “*Што гэта ў небе зазвінела? / Сам Бог едзець, долечку нясець / Гэтаму дзіцяці, гэтаму маленькаму. / Ці хлебавую, ці грашавую, / Ці тую вянчальную. / Бабулечка ідзець, Богу моліцца: / - Дай, Божа, усякую: / І хлебавую, і грашавую, / І тую вянчальную*” [9, с. 205]. У аперацыйным сцэнарыі радзіннага рытуалу грошы выкарыстоўваюць у якасці магічнага сродку прадукавання “грашовай долі”, што яскрава выяўляецца ў часе першага купання дзіцяці – надзвычай важнай рытуальнай працэдуры адасаблення немаўля ад тагасвету, адкуль ён з’явіўся, і далучэння да сферы культуры [10, с. 43–44]. Звычай класці пры першым купанні срэбраныя манеты ў ваду быў шырока распаўсюджаны на ўсёй тэрыторыі Беларусі. “Каб дзіця было багатае і ў будучым радавалася жыццю, бацька кідае ў начоўкі некалькі срэбраных манет, якія застаюцца там да канца купання і потым дастаюцца бабцы” [11, с. 14]. Пры гэтым знакавай была не толькі базавая сімволіка ўласна грошай (багацце), але і металу, з якога выбіты манеты. Срэбраныя (а пазней – “белыя”) манеты мусілі спрыяць фізічнай дасканаласці дзіцёнка ў будучым, бо срэбра суадносілася з ідэяй чысціні і здароўя. “Калі народзіцца дзіця, бабка рыхтуе ваду купаць яго, а бацька кідае ў ваду срэбраныя грошы, каб дзіця было багатым і чыстым, як срэбра” [12, с. 329].

[1] Артыкул падрыхтаваны ў рамках праекта БРФФД-РДНФ (ПР) “Традиционный этнокультурный и языковой ландшафт Витебско-Псковского пограничья в конце XIX – начале XXI в.: уровни репрезентации и динамика кросскультурных связей”, дамова № Г16РП-004.

Сваё значэнне долі грошы не губляюць і пасля смерці чалавека, бо ў замагільным жыцці нябожчык, паводле народных уяўленняў, таксама мае ў іх патрэбу. У рамках пахавальнага рытуалу грашыма не толькі "выкупалі" месца на могілках, кідаючы манеты ў магільную яму, але такім чынам забяспечвалі "грашовую долю" нябожчыка ў тагасвеце. "*Грошы ў магілу кідалі, ну, каб ён (нябожчык – У. Л.) разбагацеў. Гавораць, што проста радзі багацьця, штоб яму там было. Кажуць: "Ты ж усё там палажы, бо ж там, як і тут, буду вездзе хадзіць*"[2].

У той жа час грошы магічным чынам прадукавалі заможную долю не толькі асобнага чалавека, але і сям'і ў цэлым. Адсюль распаўсюджаны звычай закладаць грошы пад зруб у часе будаўніцтва новай хаты. "*Як хату ставілі, на трэцім вянцы мелач клалі. Ня будзеш робіць дык ня будзець багата. Ну але такі закон, да, на трэцім вянцы, на куце, дзе іконка, там клалі мелач*" (Лепельскі р-н) [13, с. 315].

Грошы, як універсальны плацёжны сродак, набываюць у традыцыйнай культуры надзвычай важнае значэнне ў сімвалічных аперацыях дараабмену паміж людзьмі і сакральнай сферай у розных яе праяўленнях. На ўсёй тэрыторыі Беларусі грошы фігуруюць у практыках ахвярапрынашэння культавым аб'ектам (крыніцам, камяням, дрэвам і, зразумела, храмам), калі яны выконваюць функцыю платы чалавека за дапамогу з боку вышэйшых сілаў. У якасці ахвяры могуць фігураваць і прадукты сельскай гаспадаркі (хлеб, воўна, ручнікі), але грошы мелі прыярытэтнае значэнне. Так, ля Янавай крыніцы (в. Чарневічы Глыбоцкага р-на "*даўней людзі клалі грошы, воўну. Але грошы найболей. Як уперад была каплічка, была небальшая шыбінка высока, і людзі падымаліся, можа там якая падстаўка была. І праз аконца кідалі ахвяру*" [14, с. 193]. Адзначым, што практыка ахвяравання грошай крыніцам фіксуецца з XVII ст., калі з'яўляюцца дробныя грашовыя наміналы (соліды), шырока даступныя вясковаму насельніцтву [15, с. 225].

Як сродак разліку з прадстаўнікамі сакральнай сферы, грошы фігуруюць у каляндарнай абраднасці. Калядоўшчыкі і валачобнікі, якія ўвасаблялі "гасцей" з боскага свету, што прыносяць людзям свята і абноўленую, добрую долю, атрымлівалі ад гаспадароў не толькі пачастунак, але і грошы: "*Пачынальнічку – чарку гарэлкі / І каўбасу на талерцы. Падхватнічку – чацвярык аўса / І наверх каўбаса. / Механошу – капу грошай. / Дудару – чырвон злоты*" [16, с. 160].

Сферу сакральнага ў вясковым соцыуме прадстаўлялі і старцы, жабракі ("божыя людзі"), якія ўсведамляліся пасрэднікамі паміж людзьмі і светам памерлых продкаў. Малітвы старцаў насілі не толькі памінальны характар, але чыталіся за ўраджай і прыплод скаціны, за здароўе гаспадароў і нават на пакаранне "злоснікаў" дома [17, с. 12–16]. Падзяка старцу ў выглядзе абавязковай, пры гэтым грошы былі прыярытэтным сродкам аплаты. "*Яны хадзілі вот на магільнік, маліліся. Прыйдуць, вот ужэ званілі, як у польскіх "Усе святыя"называлісь. І усе ідуць ужэ ж на магілкі маліцца, і ідуць жабракі. І ўсе нясуць кілбасу, кусочак сала, хто хлеба, хто грошы, а яны моляцца бесперарыўна, гэтыя жабракі. Жабраку ж абязацельна нада было даць. Ай, дажа разгавора нет, абязацельна! Не было такога чалавека, каб саўсім не даў. Бальшынство давалі грошы, а ўжо у каго грошай нет, дык давалі так*" [3].

У той жа час грошы маглі выкарыстоўвацца і ў шкаданоснай магіі, у аснове чаго ляжала іх уласцівасць пераходзіць з рук у рукі [18, с. 131–132]. У прыватнасці, на грошы маглі наводзіцца разнастайныя чары з мэтай нашкодзіць таму, каму яны прызначаліся. "*А аднойчы дала Галічыха свайму ўнуку дробныя грошы, капейкі. Мальчык той прынёс іх да хаты і паклаў у сваю схованку. Маці тады пайшла спраўляцца ў хлеў, а там ляжаць і не падымаюцца свіньні. Прыйшла яна да хаты і пытаецца ў сына, ці хадзіў ён сеньня да бабулі. Мальчык і сказаў. Грошы ўкінулі ў печ, а свіньні адразу падняліся на ногі. Вось што было з той Галічыхай*" (Ушацкі р-н) [13, с. 59]. Акрамя таго, празмернае, незвычайнае для вясковай супольнасці багацце чалавека ў традыцыйнай карціне свету расцэньвалася як няправеднае, здабытае не сумленнай працай, але дачыненнямі з нячыстай сілай. Чараўнікі, "чарнакніжнікі" ці простыя сяляне маглі атрымаць вялікія грошы ад чорта, заключыўшы з ім адмысловую дамову і прадаўшы сваю душу. Грошы мог прыносіць і змей-летавец, які таксама атаясамліваўся з нячысцікам. "У адным сяле каля Свіслачы бачылі, як уначы ляцеў агонь і скрозь комін у хату ўпаў. Усе казалі, што той гаспадар з чортам знаўся, дык чорт яму грошы насіў" [19, s. 44]. Але багацце такога роду рэальнай карысці чалавеку не прыносіла. "*Чараваў, чарнакніжнік быў… Ён сваю жонку ўкрасіць, у золаці ўся на фэст ідзець. А тады прыдзець дамоў – нідзе нічога нет. Грошы зробіць, усё. Тады аддась каму тыя грошы, а там жывыя паперкі астануцца*"[4].

Такім чынам, грошы ў традыцыйнай супольнасці, апрача сваіх утылітарных функцый плацёжнага сродку, мелі выразную сімвалічную прагматыку, суаднесенай з міфалагічным канцэптам долі чалавека і прынцыпам рытуальнага дараабмену паміж людзьмі і сферай сакральнага, дзе грошы выступалі платай чалавека за спрыянне з боку вышэйшых сілаў. Аднак "грашовая доля" чалавека разумелася ў вясковым

[2] Зап. Пузікава К. у 2009 г. ад Івановай Веры Сяргееўны, 1938 г.н. у в. Тупічына Шумілінскага р-на.
[3] Зап. Валодзіна Т. і Лобач У. у 2007 г. ад Анушкевіча Уладзіміра Пятровіча, 1919 г.н. у в. Лапуты Докшыцкага р-на.
[4] Зап. Валодзіна Т. у 2007 г. ад Талкач Арцеміі Сямёнаўны, 1933 г.н. і Карзевіч Кацярыны Сямёнаўны, 1922 г.н. у в. Сарокі Глыбоцкага р-на.

соцыуме як стан заможнасці, у той час як празмернае багацце, не ўласцівае сялянскаму асяродку, суадносілася з нячыстай сілай і неправедным шляхам атрымання грошай. Разам з тым семантыка скарбу ў міфапаэтычнай карціне свету беларусаў не зводзіцца да простай сумы, хай сабе і вельмі значнай, грашовых сродкаў, але валодае ўласнымі значэннямі, адлюстраванымі ва ўяўленнях і фальклорных творах.

**Скарб у гістарычнай рэтраспекцыі** неад’емна звязаны з асаблівасцямі грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі. У сярэднявеччы, ва ўмовах адсутнасці банкаўскай сістэмы сучаснага тыпу, “ухаванне грошай у зямлю – гэта, перш за ўсё, абыдзенны спосаб захавання…” [6, с. 43]. Перадусім “земляныя дэпазіты” мелі чыста эканамічную матывацыю, абумоўленую спецыфікай таварна-грашовых адносінаў. “У сувязі з ваганнямі рынкавых курсаў агульная сума грошай, якая адпавядала патрэбам таваразвароту сёння, магла аказацца недастатковай ці, насупраць, завялікай заўтра. У выніку гэтага паміж грашовымі сумамі і масай супрацьпастаўленых ім тавараў узнікалі неадпаведнасці. Лішкі грошай асядалі ў зямлі, ператвараліся “да лепшых часоў” у застылы мёртвы скарб, які ажываў, як толькі рынак пачынаў адчуваць грашовы голад. Манеты даставаліся з кубышак і зноў пускаліся ў зварот. Такім чынам, скарбы – своеасаблівыя рэгулятары нармальнай работы рынкавых механізмаў” [6, с. 47].

Гістарычныя крыніцы сведчаць, што ўжо ў XVI ст. практыка ўхавання грашовых скарбаў у зямлі была вельмі пашырана на тэрыторыі Беларусі, гэтаксама як і знаходкі схаваных каштоўнасцяў выпадковымі людзьмі, што прывяло да з’яўлення адпаведнай прававой нормы. У III Статуце Вялікага княства Літоўскага 1588 г. існаваў адпаведны артыкул (раздз. 9, арт. 30), які рэгуляваў спрэчныя пытанні вакол адшуканага скарба, калі галоўным крытэрыям станавілася ўласнасць на зямлю, дзе былі схаваныя каштоўнасці. “Уставуем: коли бы се трафило кому знайти в земли який скарб: гроши, серебро, золото або што иншое яко се притрафляеть находити, тогды если на своем грунте найдеть, маеть скарб бытии, чий грунт, а если бы на чыем иншом знашол, тогды половицу маеть тому дати, на чией земли знашол, а половицу собе взятии. Так теж и на заставной земли наполы разделити мають” [20, с. 268].

Вясковая супольнасць таксама не была староннім назіральнікам у таварна-грашовых адносінах, бо ўсталяванне такой формы зямельнай рэнты залежных сялян, як чынш, уцягвалі вяскоўцаў у гандлёвыя аперацыі, калі грошы, а таксама спосабы іх захавання становяцца жыццёвымі актуаліямі. Зразумела, што скарбы сялян былі куды больш сціплымі, чым грашовыя сродкі, схаваныя гандлярамі ці землеўладальнікамі, але і яны маглі акумуляваць даволі значную для свайго часу суму. Так, археолаг М.В. Клімаў у часе раскопак селішча Лучна (Полацкі р-н) выявіў скарб першай паловы XVI ст., які налічваў больш за 200 манет, а ў эквіваленце складаў 130 грошаў ВКЛ [21, с. 157–158].

Другая прычына, якая змушала людзей хаваць грошы ў зямлю – гэта ваенная небяспека і магчымае рабаўніцтва, якое заўсёды спадарожнічае вайне. У любым выпадку, якой бы не была прычына ўхавання скарбу, вайна заўсёды змяншала колькасць гаспадароў схаваных грошай, бо людзі гінулі, траплялі ў палон ці назаўжды ўцякалі ў іншыя землі. І чым больш крывавай і спусташальнай была вайна, тым больш заставалася “безгаспадарчых грошай”. Невыпадкова, што большая частка адшуканых на тэрыторыі Беларусі скарбаў былі ўхаваныя ў XVII ст. [6, с. 42, мал. 8], калі краіна апынулася ў эпіцэнтры “крывавага патопу” – вайны з Рускай дзяржавай 1654–1667 г., а незваротныя чалавечыя страты склалі больш за 53% ад даваеннай колькасці насельніцтва [22, с. 286].

Агульная традыцыя хаваць грошы ў зямлі, а таксама факт выпадковых знаходак каштоўнасцяў, што засталіся без гаспадароў, спарадзілі і такую з’яву як скарбашукальніцтва. Гэты промысел, які меў на мэце раптоўнае ўзбагачэнне, цікавіў не толькі людзей простага стану, але і манаршых асоб. Вельмі паказальным у гэтым плане з’яўляецца прывілей караля Рэчы Паспалітай і Вялікага князя Літоўскага Жыгімонта III Вазы, які быў выдадзены ў 1588 г. нейкаму Мікалаю Дуляцкаму і дазваляў апошняму здзяйсняць пошук скарбаў “на грунтах нашых некаторых Гарадзенскіх фальваркаў, а таксама і месцкіх” [23, с. 398–399]. Палову знойдзеных каштоўнасцяў (“золата, срэбра, грошай і падобнага, ці перлаў і каштоўных камянёў”) скарбашукальнік мусіў аддаць у скарб Вялікага княства Літоўскага. Вышэйшая ўхвала такой авантурнай ініцыятывы была выклікана, на думку В.У. Галубовіча, “жаданнем манарха любымі шляхамі здабыць грошы”, якіх бракавала Жыгімонту Вазе пасля вайны за каралеўскі пасад з Масіміліянам Аўгустам [23, с. 399]. Спосабы, якімі меркавалася адшукаць скарбы, і вынікі прадпрыемства засталіся невядомымі, але, хутчэй за ўсё, скарбашукальнік спадзяваўся на магічныя сродкі выяўлення скарбаў хаця б таму, што іншых на той час не існавала.

Паказальнай з’яўляецца гісторыя, якая адбылася ў 1686 г., калі вучань і ягоны майстра спрабавалі здабыць скарб з дапамогай чараў. “Калі аднаго разу… вучань ішоў міма вёскі Дуняны, тады ўбачыў агонь, што зьзяе з-пад зямлі. Тады той вучань паведаў пра гэта свайму майстру Скісцюнову і намаўляў яго, каб ішлі да буртніка (чараўніка), каб той ім скарб дастаў. І так хадзілі да адной бабы, вярнуўшыся ад якой, капалі той скарб, але не знайшлі, і (майстра) пачаў вучня папракаць, што яго звадзіў дарэмна” [24, s. 30]. Марная спроба адшукаць скарб у дадзеным выпадку зусім не азначала, што знаходкі схаваных каштоўнасцяў адбываліся толькі ва ўяўленні і фальклорных творах, бо велізарная колькасць грашовых



Polotsk SU

дэпазітаў, якія захоўваліся ў зямлі і часта заставаліся незапатрабаваныя былым гаспадаром, рана ці позна знаходзіла новых гаспадароў.

**Рэальныя скарбы** не былі выключна рэдкай і ўнікальнай з'явай на беларускіх землях. Даследчыкі-нумізматы налічылі больш за 1100 скарбаў розных эпох, якія былі выяўлены і зафіксаваны на тэрыторыі Беларусі [25]. Зразумела, што колькасць скарбаў, якія разыйшліся па руках, былі пушчаны ў зварот новымі гаспадарамі і засталіся невядомымі навуцы, не паддаецца злічэнню, а агульная маса адшуканых грашовых сродкаў мусіць быць проста каласальнай. Абставіны выяўлення скарбаў паказваюць, што практычна ва ўсіх выпадках размова ідзе пра нечаканую, выпадковую знаходку, зробленую, як правіла, у часе земляных работ. Ніколі ў гістарычных крыніцах не фігуруе скарб, знойдзены ў працэсе мэтанакіраванага скарбашукальніцтва (пошук каштоўнасцяў з дапамогай металадэтэктараў, які атрымаў шырокае распаўсюджанне з пачатку XXI ст., тут не разглядаецца). Звычайна "шчасліўцамі", якім трапіўся скарб, былі сяляне, бо палявыя работы з'яўляюцца менавіта іх прэрагатывай.

Значную колькасць такіх выпадкаў на тэрыторыі Гродзенскай губерні ў другой палове XIX ст. зафіксаваў археолаг Ф.В. Пакроўскі. Так, напрыклад, "у 1870-х гадах салдат Чахоўскі, капаючы грады на сваім гародзе, у Мсцібаве, знайшоў гліняны гаршчок з дробнымі срэбранымі манетамі", "адзін вясковец в. Баброўнікі вырыў на сваім гародзе невялікі гліняны гаршчок са старадаўнімі меднымі нямецкімі манетамі"; "у 1868 г. у Імператарскую археалагічную камісію быў дастаўлены скарб, які складаўся з 1128 манет, знойдзеных селянінам в. Літвінок, Іллёй Купрышам. У гэтым скарбе былі палтаракі Хрысціны, срэбраныя рыжскія соліды Густава Адольфа, Хрысціны, Карла Густава, медныя літоўскія, польскія, прускія, данцыгскія соліды і іншыя падобнага роду манеты" [26, с. 40, 45, 85].

Аналагічныя абставіны знаходак скарбаў характэрныя і для XX ст. "Як правіла, грашовыя ўхаванні выяўляюцца пры ўзворванні поля, рыцці катлавану для падмурка будынка на будоўлі, пракладцы новых і добраўпарадкаванні старых дарог, асушэнні балот, карчаванні пнёў"[6, с. 41]. Выпадковасць і нечаканасць знаходкі скарба надзвычай яскрава адлюстравана ў выпадках, калі грошы знаходзіць нават не чалавек, а хатняя жывёла. "У 1921 г. пад Слуцкам жанчына, якая пасвіла свінню, са здзіўленнем убачыла, як жывёла вывярнула з-пад зямлі гаршчок, напоўнены лівонскімі і нідэрландскімі манетамі XVII ст. Выпадак, здавалася б, непаўторны. Аднак яшчэ двойчы свінні выступалі ў ролі ўдачлівых скарбашукальнікаў: у 1961 г. (в. Вёска Старобінскага р-на Мінскай воб.: польска-літоўскія манеты XVII ст.) і ў 1963 г. (в. Атрубок Докшыцкага р-на Віцебскай вобл.: срэбра Лівоніі і Нідэрландаў XVII ст.)" [6, с. 43].

Разам з тым, знаходка вяскоўцам скарбу спараджала, хутчэй, праблемы, чым давала яму нечаканы сродак узбагачэння. Справа ў тым, што ў рукі звычайна траплялія нізкапробныя срэбраныя (білонавыя) манеты, якія даўно выйшлі з грашовага звароту і капіталізаваць якія для селяніна, што абсалютна не разумеў спецыфікі нумізматычнага рынку, было надзвычай складана. У лепшым выпадку манеты маглі быць прададзены па мізэрных коштах яўрэям-перакупшчыкам [26, с. 62]. З другога боку, у Расійскай імперыі скарбы, знойдзеныя на дзяржаўных ці грамадскіх землях, мусілі перадавацца дзяржаве, а змоўчыць факт знаходкі грошай ва ўмовах вясковай грамады было практычна немагчыма, што выдатна паказвае палескае апавяданне, прыведзенае Ч. Пяткевічам: "*Чалавек на навіне выараў казан грошай, да як саўсім сьцямнела, прынёс дадому дай закапаў пад печчу. Было б усё добра, калі б не жончын язык; не выцерпела дай расказала куме пад прысягаю, што тая нікому не скажа, а кума шапнула сваёй куме, аж ось даведалася дзячыха…*" [27, с. 482].

Такім чынам, на практыцы скарб вымушана перадаваўся прадстаўнікам адміністрацыі і далей трапляў у Археалагічную камісію для вывучэння. Відавочна, асабліва ў выпадку значных скарбаў з паўнавартай срэбранай манетай, што мелі месца канфлікты паміж знаходчыкам, які хацеў утоіць грошы і пусціць іх сабе на карысць, і прадстаўнікамі ўладаў. "На сенакосе в. Боркаў знойдзены быў скарб, толькі частка якога, што **была адабраная** (вылучана мной – *У. Л.*) у знаходчыка, складала 547 рублёў срэбранай манетай" [26, с. 83].

Сітуацыя мала змянілася і ў савецкі час, калі чалавеку, які знайшоў і перадаў скарб дзяржаве, належала 25% ад ягонай вартасці. Бо ў дадзеным выпадку ацэньваўся толькі кошт металу, а гісторыка-культурная каштоўнасць (унікальнасць, ступень рэдкасці) манет у разлік не прымалася. Паколькі знаходкі залатых манет былі рэдкасцю, то перадача дзяржаве срэбраных, білонавых, а там больш медных манет прыносіла знаходчыку скарбу мізэрныя дэвідэнты. Аднак значэнне адшуканых скарбаў было надвычай вялікім не столькі ў матэрыяльным плане, колькі ў плашчыні ментальнай, сферы ўяўленняў і вераванняў, традыцыйнай карціне свету ў цэлым. Бо кожны знойдзены скарб, незалежна ад ягонай рэальнай каштоўнасці, у інфармацыйным полі вёскі быў яскравым пацверджаннем рэальнасці ўхаваных ад чужога вока грошай, якімі, пры пэўных умовах, можа авалодаць кожны. Зразумелым чынам, знаходка скарбу стымулявала вясковае скарбашукальніцтва, якое мела сваю "метадалогію" магічнага (сімвалічнага) характару. З другога боку, вобраз "ідэальнага скарбу", уласцівы міфапаэтычнай свядомасці, радыкальна адрозніваўся ад скарбаў рэальных і факусаваў на сабе цэлы шэраг калектыўных уяўленняў,



Polotsk SU

звязаных з канцэптамі прасторы, грошай, долі чалавека, а таксама легендарнай гісторыяй і сістэмай маральна-этычных і рэлігійных каштоўнасцяў.

**Скарб у міфапаэтычнай карціне свету беларусаў** з'яўляецца абсалютным увасабленнем багацця, якое толькі можа прыдбаць чалавек. Вельмі часта ў народнай прозе скарб прадстаўлены золатам, хоць у рэальным жыцці знаходкі не тое што залатых скарбаў, але нават адзінкавых манет былі справай рэдкай. "*Пра той камень у Зацяклясьсе гаварылі, што там нібыта золата схавана*" (Лепельскі р-н), "*Залатыя горы. Там нескалькі пагоркаў. Гавораць, што там закапана французамі золата*" (Полацкі р-н), "*Аднойчы на Гарадку да мужыка падышла жанчына і папрасіла выцерці ёй нос. А мужчына адказаўся. Калі б сагласіўся, пасыпалася б золата*" (Верхнядзвінскі р-н) [14, с. 246, 247, 277]; "*Старыя людзі кажуць, што між Новаю і Старою Хадароўкаю ест на полі дзве крушні, то пад гэтымі крушнямі павінна быць закопана дванаццаць бочак золата ад тых часоў, як рознага войска многа хадзіла: Сасы, татарэ да тарантасы*" (Гродзенская губ), "Даўным-даўно, калі, кажуць, яшчэ і Пінска не было, нейкі багаты пан закапаў, паміраючы, скарб – шмат золата" (Пінскі р-н) [28, с. 425, 432].

Золата ў паданнях пра скарбы фігуруе невыпадкова, бо ў міфалогіі яно займае вышэйшае месца ў сімвалічнай іерархіі металаў і ўвасабляе сабой такія ідэі як веліч, дасканаласць, сіла, улада, багацце, мудрасць [29, с. 147]. Паказальнай для разумення сімвалічнага значэння гэтага каштоўнага металу ў традыцыйнай духоўнай культуры з'яўляецца частотнасць узгадак лексемы "золата" ў беларускіх казках у параўнанні са "срэбрам", якое абарачалася ў манеце куды часцей за "чырвонцы". Ва ўсіх тамах казак (серыя "Беларуская народная творчасць") золата ўзгадваецца 352 (!) , а срэбра – толькі 23 разы.

У абрадавым фальклоры беларусаў золата ўвасабляе ідэальную, звышдастатковую долю чалавека і сям'і. Пры гэтым, як і ў народных гісторыях пра скарбы, золата прысутнічае ў надзвычайных, гіпертрафіраваных аб'ёмах, абсалютна не ўласцівых рэальнаму абароту залатых манет у межах вясковай супольнасці. "*Добры вечар, пане гаспадару, ой, каляда! / Харошыя маеш ты сыночкі. / Ой, што ж яны ў цябе робяць? / – У святлічцы золата важаць, / Наважылі трыццаць пудоў і чатыры. / Тыя трыццаць пану гаспадару аддалі, / А тыя чатыры нам, калядні́чкам, і калядзе*" [16, с. 227].

У каласальных аб'ёмах не толькі для вяскоўца, але і для любога чалавека, золата хаваецца ў выглядзе скарбаў, дзе мінімальная адзінка вымярэння – гаршчок (3–5 літраў), а максімальная – бочка (406,5 літра). "*Стары памёр, нявестка засякла сто курэй, і ёй дастаўся гаршчок з золатам*" (Ушацкі р-н), "*Яшчэ гаварылі, што французы ўтапілі бочку золата. Старыя людзі гаварылі, между астравоў. Тут на Несінскім возеры*" (Лепельскі р-н) [14, с. 132, 275]. З улікам шчыльнасці гэтага металу (19320 кг/м$^3$) атрымліваюцца фантастычныя сумы – ад 60–100 да 7853 кілаграмаў чыстага золата. Нескладаны матэматычны разлік яшчэ раз паказвае, што ў фальклоры вядзецца размова пра ідэальны скарб і абсалютнае багацце, недасяжнае ў рэальным жыцці.

**Суб'екты ўхавання (гаспадары) скарбаў** у народнай традыцыі падзяляюцца на дзьве няроўныя катэгорыі. Найбольш прадстаўнічай і разнастайнай з'яўляецца катэгорыя "чужынцаў" як у этнічным (французы, шведы, яўрэі), так і сацыяльным плане (князь, пан, купец, святар). Рэгіянальная спецыфіка пра ваяўнічых інтэрвентаў абумоўлена асаблівасцямі лакальнай гісторыі. Для Падзвіння, дзе баявыя дзеянні ў часе вайны 1812 г. насілі жорсткі характар, у найбольшай ступені характэрныя паданні пра "золата Напалеона", зарытае салдатамі Вялікай арміі ў "французскіх магілах" – курганных насыпах часоў Полацкага княства, а таксама на гарадзішчах жалезнага веку. "*Ай, гэтыя французскія магілы, сто раз іх правяралі. Во тут, за Буём. Ну як нейкія ж французы пабітыя тут былі, пабітыя. Там нейкая ж куча гэтага, ссуваная каменю, капаліся там, казалі, там французамі золата пахаванае…*" (Докшыцкі р-н) [14, с. 267].

У Заходняй і Паўночна-Заходняй Беларусі, а таксама на тэрыторыі Падняпроўя, дзе разгортваліся падзеі Паўночнай вайны, скарбы ў народнай традыцыі звязваюцца са шведскай арміяй. "*За паўвярсты ад вёскі Таракані Кобрынскага павета знаходзяцца старыя могілкі, на якіх у вялікую суботу штогод з'яўляюцца вогненныя язычкі ад змяркання да поўна'чы. Гэтыя язычкі… змяняюць свой колер і бываюць то белымі, то чырвонымі, то сінімі. Гэта ёсць не што іншае, як закапаныя тут шведамі грошы*" [28, с. 426].

Ва Усходнім Палессі, дзе Казацкая вайна 1648–1651 гг. мела вельмі жорсткі характар, скарбы, адпаведна, звязваюцца з казакамі. Каля Рэчыцкага бальшака на Хойнікі "*у калодзезі е вялікі браварны казан, поўны грошай, накрыты млінавым камянем. Скольки раз людзі хацелі выкапаць тыя грошы, да як толькі дакапаюцца да таго каменя, каторым пакрыты кацёл, то зараз з Рэчыцы і ляцяць казакі з голымі шаблямі. Людзі паўцякаюць, то і казакі шчэзнуць, а далей і месца зараўняецца, як бы нічога ніколі*" [27, с. 483].

Скарбы, нібыта схаваныя ваяўнічымі чужынцамі, – фальклорны матыў, які вядомы шмат якім еўрапейскім народам і, у прыватнасці, шырока прадстаўлены ў традыцыі ўсходніх славян. Як адзначае В.У. Бялова, "пра былое нашэсце народаў нагадваюць не толькі выкапаныя парэшткі і розныя збудаванні, але і такі абавязковы элемент "гісторыка-геаграфічнага фальклору", як пакінутыя прыхаднямі скарбы і каштоўнасці" [30, с. 36]. Гэтаксама шырока бытуюць і паданні пра скарбы, схаваныя прадстаўнікамі тых

PolotskSU

сацыяльных груп, якія ў будзённым жыцці характарызуюцца большай заможнасцю (наяўнасцю значных грашовых сум), у параўнанні з сялянамі. Князі, паны, купцы, святары і разбойнікі даволі часта выступаюць ухавальнікамі скарбаў у тапанімічных паданнях. "*Ну і ўсе ж тады казалі, што паны закапывалі золата і заклінали*" [14, с. 41]. Аднак у дадзеным выпадку варта пазначыць, што паданні пра скарбы паноў і святароў у найбольшай ступені актуалізуюцца ў фальклорных наратывах XX ст., калі прадстаўнікі "эксплуататарскіх класаў" былі абвешчаны па-за законам, а шматлікія напаўразбураныя фальваркі і храмы сталі аб'ектамі скарбашукальніцтва.

Асобна трэба разглядаць тэму схаванага "яўрэйскага золата", развіццё ў народных апавяданнях якой прыпадае на пасляваенныя гады і была звязана як з даўнім агульным уяўленнем пра багацце гэтай этнічнай групы, асноўным заняткам якой былі рамяство і гандаль, так і з трагедыяй халакосту на тэрыторыі Беларусі ў часе нацысцкай акупацыі. У выніку шматлікія будынкі і могілкі яўрэяў засталіся без сваіх гаспадароў і прыцягнулі ўвагу скарбашукальнікаў. Вандалізм у выглядзе рабаўніцтва могілак стаў ганебнай старонкай у гісторыі узаемадносінаў беларусаў і яўрэяў, якая сталася магчымай ва ўмовах разбурэння традыцыйнай маралі і светапоглядных прынцыпаў у савецкім грамадстве. "*Паўміралі і татары і жыды якія былі. І жыдоўскі магільнік стасавалі ўсё. Казалі, у Докшыцах адзін малец нашоў многа на жыдоўскім кладбішчы золата. Гэдак людзі казалі. Кажыць нашоў ён во золата і тады яны кажыць паехалі ў Барысаў, там сабе дом ці што яны. Што вы думаеце там у жыдоў многа было золата. Усё ж нахадзілі ў гэтай геце казалі, там усё нахадзілі после, як іх пагналі біць ужо. А за што білі жыдоў, хай бы жылі*"[5].

Другую катэгорыю ўхавальнікаў скарбаў складаюць прадстаўнікі вясковага соцыума. Звычайна размова ў фальклорных апавяданнях такога тыпу вядзецца старых багатых людзей, якія хаваюць грошы (золата) перад сваёй смерцю з тым, каб яны не дасталіся жывым нашчадкам. "Адзін багатыр, паміраючы, шкадаваў нават свайму дзіцяці грошы пакінуць" (Гродзенская губ.) [19, s. 44], "*Раней людзі былі жадныя… Раней старыя дзіцям грошы не давалі, а складалі ў гаршчок. Аднойчы стаў паміраць стары. Ён ужо аглух і аслеп. І ён пачаў хаваць грошы пад печчу*" (Ушацкі р-н) [14, с. 132]. Як варыянт, у якасці ўхавальніка і знаходчыка скарбу могуць выступаць родныя браты (багаты і бедны), але ва ўсіх выпадках гаворка вядзецца пра сямейныя адносіны і канфліктную сітуацыю, увасобленую грашыма.

Асобнае месца ў фальклоры займаюць паведамленні пра скарбы, колішнія гаспадары якіх могуць не згадвацца ўвогуле, а самі каштоўнасці выступаюць у якасці самастойных міфалагічных персанажаў і маюць абсалютна суб'ектны характар: яны выходзяць у Купальскую ноч на прасушку, могуць прыймаць выгляд людзей ці жывёл, паказвацца людзям аганькамі ці ззяннем, хавацца ад іх, выпрабоўваць, палохаць і г.д. [14, с. 133–136; 28, с. 417–428]. "Заклятыя грошы паказваюцца ўсяляк: агнём, катом, сабакаю, дзіцём, авечкаю, казою, рознымі рэчамі" [19, s. 43]. Скарбы такога роду набываюць самастойны міфалагічны статус у традыцыйнай карціне свету, што не выключае сувязі са схаваным золатам іншых міфалагічных персанажаў – чорта, хута, дамавіка. Але такія намінацыі, як "кладнік", "палявік", "пушчавік" у якасці міфалагічных апекуноў скарбаў выклікаюць сумненне, бо ў гэтай іпастасі персанажы фігуруюць толькі ў працы М.Я. Нікіфароўскага "Нячысцікі", што мела характар забаўляльнай чытанкі для шырокай публікі [31, с. 49–57].

**Абставіны, умовы і спосабы авалодання скарбам** у няказкавай народнай прозе апісваюцца даволі разнастайна, але пытанне "дастаўся / не дастаўся скарб чалавеку" з'яўляецца ключавым ва ўсіх апавяданнях падобнага тыпу. Станоўчы ці адмоўны адказ на гэтае пытанне ў кожным канкрэтным выпадку залежыць ад міфалагічнай праекцыі феномену скарба на сацыяльныя, этнакультурныя, маральна-этычныя, прасторавыя, прадметна-рэчавыя і акцыянальныя актуаліі традыцыйнай карціны свету. У прыватнасці, матыў "**грошы дастаюцца бедняку**" ўвасабляе ў фальклоры ідэалогію сацыяльнай роўнасці, характэрнай для вясковай грамады.

У сістэме жыццёвых каштоўнасцяў традыцыйнай супольнасці грошы выступаюць важным чыннікам чалавечае долі ("Дай жа Божа, таму дзіцяці долю збажавую, грашавую, вянчальную"). Пры гэтым доля персанальная разглядалася як інтэгральная частка калектыўнай долі, што яскрава адлюстравана ва ўсіх рытуалах сямейнага тыпу. Прыход / сыход ці з'яўленне "новых людзей" (маладыя муж і жонка ў часе вяселля) у грамадзе вымагала сімвалічнага пераразмеркавання агульнага спору. Адсюль "бабіна каша" радзінаў, вясельны каравай і памінальная куцця – ключавыя моманты ў сацыяльнай міфалогіі, увасабленне ідэі роўнасці і гармоніі ў вясковым калектыве. Скрайняя беднасць ці празмернае багацце чалавека ў вёсцы выступалі як парушэнне сацыяльнай нормы, збой механізму размеркавання калектыўнай долі, у т.л. яе грашовай іпастасі. У фальклорных творах выпраўленнем гэтай дэвіяцыі займаецца сам Бог, хоць у тэксце можа непасрэдна і не ўзгадвацца. Адным са спосабаў сацыяльнай рэгуляцыі ёсць "грашовая інтэрвенцыя" з боку вышэйшых сілаў у свет людзей. Скарб (грошы, золата) у дадзеным выпадку выконвае кампенсатарную функцыю: бедны брат (мнагадзетная ўдава), атрымаўшы грошы ад

[5] Зап. аўтар у 2009 г. ад Васілевіч Анастасіі Ігнацьеўны, 1922 г.н. у в. Шалашы Докшыцкага р-на.



Polotsk.su

Бога, не становіцца багатым, але выбаўляецца з нішчымніцы, а багаты брат, пакараны за сваю хцівасць і сквапнасць, губляе частку скарбу (тут мы маем на ўвазе майно, але гульня значэнняў слова "скарб" паказальная) і пераходзіць у катэгорыю "сярэднякоў", пачынае адпавядаць "норме". "*Былі багаты брат і бедны. Бедны пайшоў да багатага аганьку папрасіць у яго. А хацеў хуць калатухі зварыць рабятам. Выйшаў багаты, дажа ў хату беднага не пусціў, кажа: "Няма ў мяне нічога!" Ну, што дзелаць, пайшоў бедны ад яго. Хадзіў, хадзіў ён, бачыць аганёк у лесе. Пайшоў туды. Глядзіць ля вугалькоў сядзіць стары. Стары яму гаворыць: "Гэта не вугалькі – гэта золата, бяры, колькі табе нада. Толькі не хваліся нікаму". Бедны набраў золата і пайшоў дамоў. Ну, а як ішоў ля багатага, ня выцярпеў, брат усё-такі. Узяў і пахваліўся яму. Багаты аж затросься: яму золата таксама захацелася. Распытаў беднага, дзе той золата ўзяў, і пабег у лес. Прыбягаець, а там той стары сядзіць. Багаты яму і гаворыць, каб і яму такіх аганькоў даў, як беднаму. А стары усьміхнуўся і гаворыць: "Паглядзі, вунь колькі у цябе аганькоў". Аглянуўся багаты, а ягоная хата, як сьвечка гарыць*" (Расонскі р-н) [14, с. 58]. Уласна золата (грошы) у апавяданнях такога тыпу – толькі інструмент у руках Бога – яны не з'яўляюцца ядравым канцэптам, але абслугоўваюць галоўную ідэю – сацыяльнай (= маёмаснай) роўнасці.

Усе астатнія паданні пра скарбы-золата выразна падзяляюцца на 2 тыпы як паводле сваёй прасторавай лакалізацыі (умоўна: "***сядзібныя***" і "***знадворныя***"), так і паводле крэтэрыяў даступнасці чалавеку (дасяжныя/недасяжныя). "Знадворныя" скарбы – каштоўнасці, ухаваныя па-за межамі сядзібы-вёскі, у фальклорнай традыцыі суадносяцца з "чужакамі" як у этнічным (татары, шведы, французы), так і сацыяльным (князь, кароль, пан) вымярэнні, альбо маюць ананімны характар. Курганы, гарадзішчы, азёры, камяні, нават балоты і дрэвы – рэестр ландшафтных аб'ектаў сітуацыйна вар'іруецца суадносна з мясцовай традыцыяй, але заўсёды рэпрэзентуе тагасвет у яго прасторавым вымярэнні. Сутнасным стае тое, што скарбы гэтай катэгорыі недасяжныя людзям. У большасці паданняў пра пошук такіх скарбаў, высілкі экспедыцыянераў аказваюцца марнымі. "*Сундук вылез, но гэта нада было знаць, што сказаць. Схавана было, што-то схавана заклінанае. Вот можа як раз какое-та заклінаньне давалі. Хто найдзець. І ніхто не найшоў. Капалі мужыкі, капалі, как праваліўся сундук, сундук бальшой быў, і нічога не нашлі*" (Клімавіцкі р-н); "*Возера топкае, зарасло мохам. Былі спрабавалі дастаць напалеёнаўскае золата, але поспеху ніхто не дабіўся. Можа і зараз пад ілам і мохам ляжыць тое золата*" (Ушацкі р-н) [14, с. 136, 181].

Значна радзей чалавек авалодвае золатам, але мусіць пакінуць яго на месцы, каб захаваць жыццё ці здароўе, бо плата за адшуканае багацце аказваецца непамернай. "*Паміраючы і не маючы наследнікаў, княгіня пракляла і церам, і ўсё сваё багацце. З цягам часу гэты церам зруйнаваўся і на яго месцы засталася толькі вялікая гара. Кажуць, што адзін чалавек, ведаючы, што тут некалі было, схацеў пакарыстацца яе скарбам. Адшукаў грошы, набраў, як панесці, але ў той самы момант, як захацеў пайсці з набытаю казною, аслеп і не трапіў на сваю дарогу, хоць яна была тут жа каля яго. Тады ён сцяміў, у чым справа, кінуў казну на былым яе месцы і тады ізноў стаў відушчым і пайшоў сабе*" (Ігуменскі пав.) [28, с. 430]. Калі ж знаходчык вырашае пакінуць такі скарб сабе, то, у выніку, мае вялікія страты ў сваёй жыццёвай долі, несувымерныя ні з якімі грашыма. "*Жылі людзі ў адной дзярэўні, і па начах лётаў па полі нейкі конь. Чалавек ноччы каня падпільнаваў і стукнуў палкай. А той конь быў ня конь, а золата зачараванае лётала. Як стукнуў, так золата і пасыпалася. І ён набраў цэлы гаршчок. А гэта золата было заклятае. Як стаў купляць будынак, у тым будынку ўся сям'я памёрла, а сам ён захварэў, рукі-ногі паскручвала, хадзіў міластыню прасіў*" (Глыбоцкі р-н) [32, с. 285]. Такім чынам, усе скарбы, ухаваныя ў знешняй, "чужой" прасторы, разумеліся як зачараваныя і пры гэтым небяспечныя для чалавека. Беспакарана авалодаць імі можна толькі скарыстаўшыся міфалагічнай метадалогіяй "рэальнасці нерэальнага", што на практыцы зводзіла шанцы на поспех да нуля. "*А во Шведава гара. Шведамі яна насыпана. Када ішла вайна, ішоў швед, і кажды, гаварaць, ну шлём, па шапцы насыпалі – і гару насыпалі. Тут убіты глаўны іхны. І ён умураваны сярод гары гэтай. І тут жа дзе-то ёсць і вароты. Дзверы, да. Ёсць. Але ніхто не знаіць. Дзверы на васток. Тут какая-та пасловіца дзедава: бочку золата (дастанеш), еслі на бычку, на трэцячку з'едзеш у Вільна за тры часы, і прыедзеш. Золата тады*" (Докшыцкі р-н) [14, с. 250].

Уяўная бессэнсоўнасць фальклорнай інфармацыі пра "знадворныя скарбы", калі пакаленне за пакаленнем вясковыя скарбашукальнікі выпраўляюцца па "французскае золата" і не могуць яго дастаць, з'ўляецца толькі вонкавай, спароджанай рацыянальным мысленнем. Сімвалічная прагматыка скарбавых локусаў у палатне вясковага культурнага ландшафту надзвычай вялікая і можа быць зразумелая толькі ў больш шырокім кантэксце міфалогіі прасторы. Дзеля гэтага варта ўбачыць прынцыповую розніцу паміж сэнсавым напаўненнем "унутранай" (сядзіба, вёска) і "знешняй" (ваколіцы) прасторай вясковага ландшафту. Экспедыцыйны вопыт паказвае, што знадворная тэрыторыя (лес, урочышчы, вадаёмы, палеткі) любога мікрасвету (вёска ці куст вёсак) у сельскай мясцовасці ніколі не бывае нейтральнай, "ніякай" у сакральным сэнсе. Святыя крыніцы, "шведскія магілы", "чортавы камяні", "царкавішчы" і, вядома, "скарбавыя месцы" – поўнага набору сакральных локусаў у адным вясковым "свеце" ніколі не будзе, але хоць адзін (часцей два-тры) – абавязкова. Знешняя прастора, што суаднесена з тагасветам, заўсёды пульсуе знакамі і сэнсамі, якіх няма сярод вясковых хат і хлявоў.

PolotskSU

Рытмічная пульсацыя скарбаў (мігцяць, ззяюць агеньчыкамі, паказваюцца ў выглядзе жывёл і г.д.) нагадвае пульсацыю зніклых храмаў, званы якіх можна пачуць з-пад зямлі ў вялікае свята. Скарб можна ўбачыць, а зніклы храм можна пачуць, але ў абодвух выпадках да іх немагчыма дакрануцца. Сэнс бясконцых паўтораў скарбашукальніцтва (як і паходаў на "Царкавішча", каб паслухаць званы з-пад зямлі) у дыялагічнасці паміж чалавекам і сферай sacrum, якую можна апісаць схемаю "чытач – тэкст", калі кожны новы чытач спрабуе адшукаць "паміж радкоў" нешта сваё ў даўно вядомым, але ад таго не менш загадкавым паведамленні. І калі для вясковага скарбашукальніка няўдалы паход за "французскім золатам" – гэта няспраўджаныя мары пра "лепшую долю", то для ўсёй грамады – гэта чарговае перачытванне і запамінанне сваёй гісторыі ў яе міфалагічным вымярэнні. У гэтым сэнсе веды пра схаваны скарб куды важней за яго самога, бо ў выпадку, калі б яго выкапалі, у сакральнай гісторыі месца была б пастаўлена фінальная кропка.

"Сядзібныя" альбо сямейныя паданні пра скарбы прынцыпова адрозніваюцца ад першай, "знадворнай" катэгорыі тым, што яны не ўключаны ў міфалогію прасторы і іх бытаванне не падтрымлівае градус семіятычнай напругі лакальнага культурнага ландшафту. Прасцей кажучы, няма дакладнага месца, з якім можна суаднесці такое паведамленне.

Сюжэты "сядзібных" паданняў падзяляюцца на два тыпы: багаты стары гаспадар не жадае пакідаць свае грошы нашчадкам і хавае іх у выглядзе заклятага скарбу; нявольнай сведкай таемнай аперацыі становіцца нявестка (альбо салдат), якая пасля смерці свёкра, выкарыстаўшы магічны код, авалодвае грашыма. Другі сюжэт заключаецца ў тым, што людзі не маюць ніякага намеру раптоўнага ўзбагачэння, але скарб сам перыядычна дае пра сябе знаць рознымі праявамі ці зданямі, пакуль не трапляе ў чалавечыя рукі.

У першым выпадку, нелагічнасць, нерацыянальнасць рашэння старога чалавека схаваць грошы перад сваёй смерцю, каб яны не дасталіся жывым нашчадкам, ёсць чыста фармальнай, бо прагматыка такога ўчынку мае міфалагічныя вытокі і зноў-такі выводзіць на канцэпт долі. Золата, якое найчасцей фігуруе ў паданнях пра скарбы, з'яўляецца прадметным і канцэнтраваным увасабленнем шчаслівай, звышдастатковай долі, а таксама сімвалізуе ўладу, багацце, сілу, дасканаласць, веліч і мудрасць. Схаваць багацце ад жывых перад сваёй смерцю азначае забраць яго з сабой на "той" свет і, такім чынам, перацягнуць жыццёвы шанцунак і неверагодны спор у замагілле, дзе, паводле беларускіх народных яўленняў, грошы працягваюць захоўваць сваю актуальнасць і функцыянальнасць. У раннім сярэднявеччы такая магічная транзакцыя каштоўнасцяў у свет памерлых была вядомая ў скандынаваў. Як адзначаў А.Я. Гурэвіч, "у золаце, па вераваннях скандынаваў і германцаў, матэрыялізавалася шчасце яго ўладальнікаў. Кіруючыся гэтымі ўяўленнямі, нарманы імкнуліся схаваць наклопленыя імі манеты без разліку на тое, што выкапаюць іх у будучым: скарб, пакуль ён ляжаў некранутым у зямлі альбо на дне вадаёму, захоўваў у сабе ўдачу свайго гаспадара і таму быў неадчужаемы. Срэбра і золата валодалі сакральна-магічнай сілай у вачах варвараў" [7, с. 185]. Але і ў беларускай традыцыі, як адзначаў В.Н. Рабцэвіч, сярод усіх адшуканых скарбаў, большасць якіх захоўвалася на невялікай глыбіні (20–25 см), сустракаліся такія, што былі закапаныя на метр і болей, і, хутчэй за ўсё, не падлягалі далейшаму выкарыстанню [6, с. 45].

Аднак у сістэме традыцыйнай маралі і этыкі сама наяўнасць вельмі багатага чалавека ў вёсцы спараджала сітуацыю сацыяльнай напругі і мела адпаведнае адлюстраванне ў міфалагічных уяўленнях: такія грошы не маглі быць зробленыя сумленнай працай (празмернае багацце вельмі часта прыпісваецца хаўрусу чалавека з нячыстай сілай: "*Багатаму чорт дзеці калышыць*", "*Багатаму і чорт у кашу маслам кідае*") і ёсць вынікам несправядлівага размеркавання калектыўнай долі (антыподам вельмі багатага заўсёды будзе вельмі бедны). Спроба магічным чынам перацягнуць на той свет багацце – гэта замах не толькі на долю ўласнага рода, які багацей хоча пазбавіць спадчыны, але і імкненне назаўжды спісаць з рахунку калектыўнай долі вялізны аб'ём дабротаў, канцэнтравана ўвасобленых грашыма (золатам) і прысабечаны няправедным шляхам яшчэ пры жыцці. Такім чынам, скарбы "знадворныя" і "сядзібныя" (сямейныя) маюць прынцыпова розную сімвалічную нагрузку. Першыя выступаюць атрыбутам тагасвету ў разнастайных яго праявах і персаніфікацыях, і, як атрыбут, не могуць быць адасоблены чалавекам ад міфалагічных французаў (шведаў, князя, пана і іншых засветных персанажаў). Чалавек не можа дастаць "знадворныя" скарбы роўна ў той ступені, у якой не можа ануляваць адну з базавых характарыстык сакральнай сферы – яе першынства, вяршэнства і звышдастатковасць (у энергетычным, інфармацыйным і маёмасным вымярэнні) у параўнанні са светам людзей. Тыя ж нешматлікія выпадкі, калі чалавек нейкім чынам здабывае такі скарб, сканчаюцца вельмі трагічна – смерцю, калецтвам "шчасліўца" ці ягоных блізкіх сваякоў. Падобны фінал толькі падкрэслівае сутнасную асаблівасць "знадворных" скарбаў – яны не могуць належаць людзям і быць рэалізаванымі ў чалавечым свеце.

Калі "знадворныя" скарбы недасяжныя для чалавека, то ўсе "сядзібныя" скарбы ў фальклорных апавяданнях трапляюць у рукі людзей. У дадзеным выпадку, на першы план выходзіць сацыяльнае вымярэнне прасторы (чалавек – род (сям'я) – грамада), а не яе міфалагічны зрэз (курганы, гарадзішчы, зам-

чышчы, камяні-скарбавікі, заклятыя азёры ды інш.). Уладальнік багацця (багач, свёкар, дзед) мае сацыяльную, але не міфалагічную ідэнтыфікацыю, што, аднак, не выключае наяўнасці міфалагічных матываў у паданнях такога роду. Звяртае на сябе ўвагу, што практычна на ўсёй этнічнай тэрыторыі Беларусі ў паданнях пра сямейныя скарбы фігуруе ўстойлівая пара персанажаў: **свёкр – нявестка**, і менавіта апошняя авалодвае схаванымі каштоўнасцямі. "*Ляжала ў хаце за занавескай нявестка, а свёкар думаў, што ў хаце нікога няма, і закапаў пад падлогай грошы, і закляў іх, і сказаў, што без маёй рукі ніхто грошы не возьмець, і памёр. А нявестка тады ўзяла ды і раскапала яго рукой грошы*" (Ушацкі р-н) [14, с. 132]; "*…колісь дзед старый, бывала золата ў яго. А ён адчыніў мосьніцу, да не бачыць, што нявестка на печы лежыць… От етая нявестка… да выкапала то золата, а ён пагіб*" (Калінкавіцкі р-н) [33, с. 684–685].

Персанаж нявесткі ў дадзенай сітуацыі падаецца зусім невыпадковым, бо ў межах патрыярхальнай сям'і яна ўвасабляе "чужога" чалавека, прадстаўніка не рода, але вясковай грамады. Цалкам верагодна, што авалоданне ёю скарбам метафарычна азначае не толькі вяртанне грошай у сям'ю, але іх рэквізіцыю (перадзел) з боку ўсёй супольнасці. Паказальным ёсць запіс У. Дабравольскага, калі нявестка здабывае свёкраў скарб у часе пахавання і, тым самым, прад'яўляе "таемныя грошы" ўсяму калектыву: "*Прысніўся маладухі сон (у яе у то ўремя свёкыр пуміраў). – "Паскач на ём, як ён памрэць, голая: клад тады знайдзіш". Іна давай плісаць па ём, як ён прікончіўся. Усе думалі, што іна тронуўшысь. Ну, іна клад такі знайшла*" [34, с. 165]. І нават калі скарб скнарлівага старога дапамагае здабыць староннi чалавек (старац, падарожны, салдат), у апавяданні ўсё адно прысутнічае ідэя пераразмеркавання празмернай, звышдастатковай гаршовай долі, сканцэнтраванай у аднаго чалавека. "*А перш чым раскопваць яму, салдат сказаў: – Слухайце, тыя грошы, што да крыжыка, –- мае, а што пасля крыжыка – вашы*" [28, с. 307].

Матыў "навязлівага скарбу", які пастаянна прыдаецца людзям непасрэдна ў іх хаце, пакуль не трапляе ў іх рукі, на нашую думку, мае грунтам міфалагічныя прынцыпы культурнага засваення прасторы чалавекам, калі будаўніцтва дома азначае вылучэнне і адасабленне ад знешняга свету месца, якое "найбольш адэкватна апісваецца з дапамогай такіх катэгорый, як сваё, блізкае; прыналежнае чалавеку; звязанае з паняццем долі, лёсу; галоўнае (сакральнае); звязанае з агнём ачагу і да т.п." [36, с. 25]. Такім чынам, ухаваны скарб аказваецца на тэрыторыі, прыватызаванай чалавекам у выніку будаўніцтва, і ўжо па вызначэнні належыць гаспадарам дома, хоць яны пра тое могуць і не здагадвацца. На карысць гэтага меркавання служыць тая акалічнасць, што ў паданнях такога тыпу часта фігуруе менавіта будаўніцтва новай хаты, г.зн. кантэкстам выступае рытуальнае засваенне прасторы чалавекам. "*Адзін чалавек паставіў сабе нову хатку, але не мог там быць, бо ўсё штоноччу крычала: – Ці вывернуць? Так, бала, яны і ўцякаюць. Аднаго разу ідзе падарожна: – Ну, – кажа, – я буду спаць. – Добра. Лёг той, ажно давай крычаць: – Ці вывернуць? – Ну, то выверні. Так паўнютку хату золата навярнуў*" (Ваўкавыскі пав.) [35, s. 50]. Медыятарам паміж скарбам і людзьмі ізноў выступае падарожны ("чужы") чалавек, які і праводзіць пераразмеркаванне багацця: адна доля дастаецца гаспадарам, другая – выпраўляецца ў свет: "*Ажно…лезе да яго баран, а ён як спукае яму кіем па лобе, так, муляў, золата і рассыпалася, да ўсё імпералы. Той нагарнуў сабе колька хацеў, а рэшту гаспадаром аставіў і пайшоў у свет вандраваць*" (Ваўкавыскі пав.) [35, s. 50].

Па-за ўсякімі сімвалічнымі ўмовамі, кодамі, магічнымі маніпуляцыямі скарбы (золата, грошы) дастаюцца толькі адной катэгорыі вясковага соцыума – **дзецям**, што не маюць такіх заганаў як сквапнасць, хцівасць, срэбралюбства, не разумеюць каштоўнасць грошай і ўспрымаюць іх як цацкі. "*Аднаму малому хлопцу аказаўся на сметніку скарб, а больш яго ніхто не бачыў. Ён усё насіў кішэнькамі да хаты, насіў і сыпаў срэбра на запечку. Ажно ўгледзілі гэта бацькі, так давай хлопца дапытваць: - "Скуль гэта?" – "А то ж вунь дзе, на сметніку гурба ляжыць". Бацькі хутчэй гэта выбягаюць, але нічога ўжо не было, бо скарб увайшоў у зямлю*" (Гродзенская губ) [35, s. 44]. З аднаго боку, малыя дзеці ў міфапаэтычнай карціне свету па біясацыяльнай шкале масімальна набліжаны да іншасвету ў яго часавых і прасторавых праяўленнях, што дазваляе ім бачыць недасяжнае дарослым (для апошніх уласцівая зваротная інверсія: атрымліваюць ад чорта золата, якое ў хаце ператвараецца ў конскі кал ці смецце). З другога боку, грошы, даваныя малым дзецям вышэйшымі сіламі, – гэта частка іх долі, якая хоць і даецца Богам ад нараджэння, але фармуецца даволі доўга (прыгадай, што развязванне пупавіны і дыягностыка разумовых здольнасцяў дзіцяці адбываецца даволі позна, у 3–5 гадоў). Адсюль немаўля можа атрымаць скарб як сваю наканаваную долю, не прыклаўшы да гэтага ніякіх намаганняў, хоць у гэтым выпадку мы ізноў назіраем цесную карэляцыю паміж спорам асабістым і калектыўным, а таксама сацыяльныя ідэалы роўнасці. "*Як даўней жа жалі сярпамі, ну і вот жала, а рабёнак малы, даўней каганы такія, як люлька. Ну і мужык прыйшоў і яны пашлі, і гэтага рабёнка забыліся. Ужо вечарам прышлі дамоў, ну скаціна ж ёсць, спарадкавалі, а тады – ай-яй-яй! Агледзіліся, што гэтага малога кінулі, ну і пабеглі туды. Бягуць і гэдак крычэлі, што якраз люлечка як гарыць. Прыбеглі, а там насыпана столька золата – увесь абсыпаны ён золатам, гэты рабёнак. Ну і гэтага рабёнка схвацілі, усё гэта золата прыпёрлі дамоў, а як там, яны дужа бедна жылі, рэбят многа, а зямлі ня дужа. Тады, як там разузнаў багач, што ўжо гэтаму рабёнку нехта золата насыпаў, тады спеціяльна кінулі гэтага рабёнка каля лесу ці дзе, і пашлі дамоў. Ну,*

*падаждалі яны, пашлі, ажно прыходзяць, а ў гэнай калясцы воўк ляжыць, а рабёнка нет. Калі гэта праўда, гэта ўжо Бог так даў, калі тыя забыліся па беднаце, а гэты хацеў яшчэ болей багацьця*" (Ушацкі р-н) [14, с. 42].

Невыпадкова, што менавіта немаўля, якому яшчэ належыць атрымаць сваю долю, фігуруе ў магічным спосабе авалодання скарбам, бо дарослыя, чыю долю змяніць ужо немагчыма, шанцаў авалодаць тагасветным золатам не маюць. "*Гэта мне паказала баба Мар'я. Вот яна мне сказала, што там находзіцца камень. Пад гэтым камнем валова шкура і з кладам. Ну яго, эты клад, можаць узяць толькі ў поўнач, ну ў 12 часоў ночы, чалавек, еслі ў эта ўрэмя ў іх немаўля радзілася. То рукой узяўшы ручку немаўля, эты чалавек можаць забраць увесь клад*" (Лепельскі р-н) [14, с. 246].

Падобным чынам могуць атрымаць скарб і бажавольныя людзі, чый розум і свядомасць мала адрозніваецца ад дзіцячых (адсюль, *здзяцінець* – мысліць, разважаць, як дзіця), а грошы таксама не ўяўляюць каштоўнасці. Паказальна, што ў апавяданні, прыведзеным М. Федароўскім, скарб, які дастаўся "дурной дзеўцы", быў ёю раздадзены дзецям. "*Сярод лета жалі дзьве дзеўкі жыта пад лесам, адна з іх была дурная. Як надыйшоў палудзень, пакладіся яны спаць пад метлікам. Разумная зараз заснула, а дурная ўсё перакідаецца. Пасля заззяла ёй у ваччу, глядзіць, ажно недалёка з-пад вялікага каменя усё золата выходзіць на верх! Яна хутчэй туды падбегла дый давай гарнуць хутчэй у фартух. Пасля, як ужо повен нагарнула, так давай на тую крычаць: "А-ёй, сястронка, чорт грашмі сера!" Тая схапілася, прыбягае, ажно золата ўсё ўходзіць у зямлю. Ледзьве яна жменечку яшчэ ўхапіла. Ідуць да хаты, назлятаіася дзяцей, а тая дурная, то таму жменьку, то таму жменьку і ўсё золата раздала*" (Гродзенская губ.) [35, s. 44].

Такім чынам, уяўленні беларусаў пра скарбы адлюстроўваюць як гістарычную рэальнасць, так і міфалагічныя асаблівасці яе асэнсавання. Грошы (золата) увасабляюць у традыцыйнай карціне свету адзін з аспектаў чалавечай долі, але ў выглядзе скарба выступаюць сэнсавым ядром пры мадэляванні правілаў сімвалічных паводзінаў і каштоўнасных арыентацый як у межах соцыума, так і ў рамках камунікацыі чалавека з іншасветам ці яго прадстаўнікамі.

ЛІТАРАТУРА


1. Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка ; навук.рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск : Беларусь, 2011. – С. 30–31, 128–131, 262, 444–445.
2. Богданов, К.А. Деньги в фольклоре / К.А. Богданов. – СПб. : Белл, 1995. –124 с.
3. Фетиш и табу: Антропология денег в России : сб. научных статей / сост. А.С. Архипова, Я. Фрухтманн – М. : ОГИ, 2013. – 528 с.
4. Криничная, Н.А. Историко-этнографическая основа преданий о «зачарованных кладах» (по материалам русских северных преданий) / Н.А. Криничная // Советская этнография. – 1977. – №4. – С. 105–111.
5. Макаров, Н.А. Магические обряды при сокрытии клада на Руси / Н.А. Макаров // Советская археология. – 1981. – № 4. – С. 261–264.
6. Рябцевич, В.Н. О чем рассказывают монеты / В.Н. Рябцевич. – Мінск : Нар.асвета, 1977. – 399 с.
7. Гуревич, А.Я. Категории средневековой культуры / А.Я. Гуревич. – М. : Искусство, 1984. – 350 с.
8. Сержпутоўскі, А.К. Казкі і апавяданні беларусаў Слуцкага павета / А.К. Сержпутоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 2000. – 270 с.
9. Радзіны : абрад. Песні. / уклад. і сістэм. тэкстаў Г.А. Пятроўскай, апісанне абрадаў Т.І. Кухаронак ; уступ. арт. і камент. Г.А. Пятроўскай, Г.В, Таўлай, Т.І. Кухаронак ; рэдкал.: А.С. Фядосік [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 1998. – 637 с.
10. Байбурин, А.К. Ритуал в традиционной культуре: Структурно-семантический анализ восточнославянских обрядов / А.К. Байбурин. – СПб. : Наука, 1993. – 240 с.
11. Никифоровский, Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи... Витебской Белоруссии / Н.Я. Никифоровский. – Витебск: Губерн. Типо-Литограф., 1897. – 338 с.
12. Романов, Е.Р. Белорусский сборник / Е.Р. Романов. – Вильно : Тип. А.Г.Сыркина, 1912. – Вып. VIII. – 411 с.
13. Полацкі этнаграфічны зборнік / уклад., прадм. і паказ. У.А. Лобача. – Вып. 2 : Народная проза беларусаў Падзвіння : у 2 ч. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – Ч. 2. – 368 с.
14. Полацкі этнаграфічны зборнік / уклад., прадм. і паказ. У.А. Лобача. – Вып. 2 : Народная проза беларусаў Падзвіння : у 2 ч. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – Ч. 1. – 292 с.
15. Лобач, У.А. Культавыя крыніцы Беларускага Падзвіння: вопыт арэальнага даследавання /У.А. Лобач // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых даследаванняў (да 80-годдзя пачатку археалагічных даследаванняў у г. Полацку) : зб. навук. прац рэсп. навук.-практ. семінара, Полацк, 20–21 лістап. 2008 г. / пад агульн. рэд. Д.У Дука, У.А. Лобача. – Наваполацк : ПДУ, 2009. – С. 213–226.
16. Зімовыя песні / рэд. М.Я. Грынблат. – Мінск :Навука і тэхніка, 1975. –736 с.
17. Никифоровский, Н.Я. Очерки Витебской Белоруссии. / Н.Я. Никифоровский. – М. : Скоропечатня А.А. Левенсона, 1892. – Вып. 1. Старцы. – 36 с.

18. Мороз, А. Деньги в мифологических представлениях и обрядовых практиках / А. Мороз, Н. Петров // Фетиш и табу: Антропология денег в России : сб. науч. статей / сост. А.С. Архипова, Я. Фрухтманн. – М. : ОГИ, 2013. – С. 119–146.
19. Federowski, M. Lud bialoruski na Rusi Litewskiej / M. Federowski. – Krakow : Wyd. Komis. Antropolog. Akad. Umiejetnosci, 1897. – T. I. – 509 s.
20. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Даведнік. Каментарыі / Беларус. Сав. Энцыкл.; рэдкал.: І.П. Шамякін (гал.рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 573 с.
21. Клімаў, М.В. Манетныя скарбы XVI ст. з мікрарэгіёна Лучна / М.В. Клімаў // Древности Беларуси в системе межкультурных связей : материалы по археологии Беларуси. – Мінск : Ін-т гісторыі НАН Беларусі, 2006. – Вып. 11. – С. 157–159.
22. Сагановіч, Г. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVII стагоддзя / Г. Сагановіч. – Мінск : Энцыклапедыкс, 2001. – 412 с.
23. Галубовіч, В. Да гісторыі скарбашукальніцтва на Беларусі: прыыілей Жыгімонта Вазы (1588) на пошук скарбаў у Гародні і яе ваколіцах / В. Галубовіч // Гарадзенскі палімпсест 2012. Людзі даўняй Гародні. XV–XX стст. / пад рэд. А.Ф. Смаленчука. – Гродна : Гарадзенская бібліятэка, 2013. – С. 398–401.
24. Pilaszek, M. Litewskie procesy czarownic w XVI–XVIII w. / M. Pilaszek // Odrodzenie i Reformacja w Polsce. – Warszawa : Semper, 2002. – T. XLVI. – S. 7–35.
25. Бекцінееў, Ш. Скарб / Ш. Бекцінееў // Энцыкл. гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г.П.пашкоў (гал.рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2001. – Т. 6. Кн. 1 : Пузыны – Усая. – С. 308.
26. Покровский, Ф.В. Археологическая карта Гродненской губернии / Ф.В. Покровский. – Вильна : Тип. А.Г. Сыркина, 1895. – 165 с.
27. Пяткевіч, Ч. Рэчыцкае Палессе / Ч. Пяткевіч / уклад., прадм. У. Васілевіча ; пер. з пол. Л. Салавей і У. Васілевіча. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2004. – 672 с.
28. Легенды і паданні / склад. М.Я Грынблат і А.І. Гурскі ; рэд.тома А.С. Фядосік. – 2-е выд., дап. і дапрац. – Мінск : Бел. навука, 2005. – 552 с.
29. Топоров, В.Н. Металлы / В.Н. Топоров // Мифы народов мира : энцикл. : в 2 т. / гл. ред. С.А. Токарев. – М. : СовЭнц., 1991. – Т. 2. К–Я. – С. 146–147.
30. Белова, О.В. Этнокультурные стереотипы в славянской традиции / О.В. Белова. – М. : Индрик, 2005. – 456 с.
31. Никифоровский, Н.Я. Нечистики, свод простонародных в Витебской Белоруссии сказаний о нечистой силе / Н.Я. Никифоровский. – Витебск : Издатель Н.А. Паньков, 1995. – 85 с.
32. Драбудзька, Н.В. Тэксты з гаворкі вёскі Кашталянаўшчына Глыбоцкага раёна / Н.В. Драбудзька // Жывое наша слова : дыялектал. зб. : да 90-годдзя чл.-кар. НАН Беларусі Ю.Ф. Мацкевіч / НАН Беларусі; Ін-т мовазнаўства імя Якуба Коласа / рэд. Л.П. Кунцэвіч. – Мінск :Бел. навука, 2001. – С. 280–289.
33. Традыцыйная мастацкая культура Беларусаў : у 6 т. / А.М. Боганева [і інш.] ; ідэя і агул. рэдагаванне Т.Б. Варфаламеевай. – Мінск : Выш. шк., 2013. – Т. 6. Цэнтральная Беларусь : у 2 кн. – Кн. 2. – 1231 с.
34. Добровольский, В.Н. Смоленский этнографический сборник / В.Н. Добровольский // Записки ИРГО по отделению этнографии. – СПб. : Тип. Е.Евдокимова, 1891. – Ч. 1. – Т. XX. – 172 с.
35. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П.В. Шейн. – СПб. : Тип. имп. Акад. наук, 1902. – Т. III. – 596 с.
36. Байбурин, А.К. Жилище в обрядах и представлениях восточных славян / А.К. Байбурин. – 2-е изд., испр. – М. : Языки славянской культуры, 2005. – 224 с.

## REAL TREASURE AND IDEAL TREASURE IN REPRESENTATIONS AND PRACTICES OF THE BELARUSIAN VILLAGE IN THE XIX–XX CENTURIES

***V. LOBACH***

*Semantics of treasures in mythopoetic picture of Belarusians of the XIX–XX centuries is examined. the Representations associated with the hidden values and magical ways and means of mastering the treasure are analyzed.*

PolotskSU